Хто такая апакаліптычная блудніца вярхом на чырвоным зверы, і што азначае гэты вобраз? Спадкаемца таталітарнага камунізму, якая распаўсюджвае у свеце разбэшчанасць? Сатане недастаткова спакусіць і разбэсціць, галоўнае – не дапусціць пакаяння. Дзеля гэтага у грамадстве ствараецца атмасфера насмешкі і адкрытага здзеку над пакаяннем. Але сярод гэтага змроку мы выразна чуем голас Божы, які кліча нас да бадзёрасці і духоўнай цвярозасці, не дазваляючы ўпасці ў адчай і самотнасць.

Вобраз прападобнай Марыі Егіпецкай, памяць якой мы сёння ўшаноўваем, – гэта яшчэ і ўзор надзеі на міласць Божую да нас, грэшных, і жывое сведчанне таго, што самыя цяжкія грахі даруе Любячы нас Гасподзь тым, хто шукае Яго. Да мужнасці заклікае нас сёння Гасподзь. Гэты ўзор подзвіга ў змаганні за запаведзь Божую дае прападобная Марыя Егіпецкая.

Амінь.

*Паводле матэрыялаў сайта http://kalozha.by/*

**З блаславення настаяцеля Свята-Міхайлаўскага прыхода**
**протаіерэя Ігара Галакава**
***Падрыхтаваў Алесь Спіцын***
**Дата выпуску: 14 красавіка 2016 г.**



# МІХАЙЛАЎСКІ ЛІСТОК

КРАСАВІК, 2016

Свята-Міхайлаўскі прыход г. Мінска, вул. Янкоўскага, 2

# ПАМЯЦЬ МАРЫІ ЕГІПЕЦКАЙ



Памяць Марыі Егіпецкай – гэта памяць міласці Божай і Божай міласэрнасці, якія не маюць межаў! Узрадуемся ж і ўзвесялімся ж, бо ў нас ёсць такі выдатны прыклад праяўлення дзеяння любві Божай ў свеце – у Хрысце і праз Хрыста, у Царкве і праз Царкву. Узрадуемся ж і ўзвесялімся ж, таму што няма такога граху, якога б Бог не мог нам даравацъ, няма такой ступені падзення, з якой бы Гасподзь не мог нас узняць! Благадаць Божая заўсёды шукае чалавека і кліча яго.

Нам таксама трэба навучыцца мужна і паслядоўна выпраўляць жыццё ў адпаведнасці з запаведзямі Божымі. Як часта мы не можам захаваць цвёрдай нашу веру, не маем пакаяннай сардэчнай малітвы і спадзявання на волю Божую.

Калі мы не дасягаем жаданай дасканаласці, мы часам маладушна абвінавачваем у гэтым акалічнасці і ўсіх вакол нас. І замест таго, каб уступіць у барацьбу са сваімі грахоўнымі звычкамі, прабівацца да Бога з верай і надзеяй, мы праяўляем духоўную слабасць і немач, падпарадкоўваючыся духу часу, апраўдваючы сябе тым, што сёння немагчымы такія подзвігі, якія здзейсніла Марыя Егіпецкая і іншыя святыя.

Магчыма, не па нашым сілам такія подзвігі пакаяння, якія явіла Марыя Егіпецкая – мы можам толькі здзіўляцца вялікай стойкасці прападобнай на працягу 47 гадоў жыцця ў пустыні. Нам бы не сорак сем гадоў жыцця, а хаця б сорак дзён Чатырохдзесятніцы і сем дзён Страснога тыдню праводзіць штодзённа як трэба – у пакаянні і малітве!

Мы не павінны маркоціцца. Маркота, туга, скруха – адны з самых цяжкіх грахоў, і не выпадкова яны трапілі ў лік так званых смяротных грахоў – менавіта таму, што ў хрысціяніна ўвогуле няма падстаў, каб тужыць, сумаваць і адчайвацца, бо тады ён ужо не хрысціянін! Той, хто так робіць – гэта чалавек з пашкоджанай душой. Толькі чалавек, які апантаны гардыняю, чалавек, які не ўмее дзякаваць і быць удзячным, а таксама той, які не мае духоўнай цвярозасці і зусім не можа жыць у згодзе з благадаццю Божай, можа маркоціцца.

Нам нельга зачарсцвець у грахах, якімі б яны ні былі. Якімі б ні былі нашы жыццёвыя звычкі і погляды, якімі б ні былі нашы хваробы, што б з намі ні здаралася, – мы не можам паддавацца сваім грахоўным страсцям і трапляць да іх у палон: мы павінны іх пераадольваць, з аднаго боку, міласцю і міласэрнасцю Божай, а, з другога боку, – сілаю служэння Госпаду, сілаю самаахвярнасці і паслухмянасці волі Божай.

Мы жывём у свеце, дзе ўсё больш і больш становіцца грахоўнага бруду. Гэта ад таго, што свет не ведае самай галоўнай таямніцы жыцця. У гэтай цемры граху, якая імкнецца паглынуць усё навокал, мы павінны мець вочы, не толькі каб плакаць па сваіх грахах, але і бачыць гэтымі вачыма небяспеку, што пагражае і нам. Мы жывём у свеце, пра які Хрыстос гаворыць: «*Ведаю твае дзеі, і што ты жывеш там, дзе трон сатаны*» (Адкр. 2:13).